# РЭФЕРАТ

Работа (65 с.) складаецца з уводзін, трох глаў і заключэння.

**Асноўныя паняцці і катэгорыі**: металексікаграфія, гісторыя лексікаграфіі, слоўнікі, лексікаграфічная крытыка, тыпалогія, інтэрпрэтацыя моўнага матэрыялу, прынцыпы лексікаграфавання, праблемы металексікаграфіі.

**Актуальнасць** працы абумоўлена апісаннем тэарэтычных канцэпцый і метадалогій падрыхтоўкі і стварэння слоўнікавых выданняў, а таксама рэцэнзій на гэтыя выданні, якія могуць унесці значны ўклад у фарміраванне і распрацоўку некаторых праблем металексікаграфіі.

**Мэта работы**: ахарактарызаваць стан і асаблівасці развіцця беларускамоўнай лексікаграфічнай крытыкі ў перыяд з канца ХІХ – да першай паловы ХХ ст.

**Аб’ект даследавання** – беларускамоўная лексікаграфічная крытыка канца ХІХ – першай паловы ХХ ст.

**Прадмет даследавання –** крытычныя матэрыялы, напісаныя на лексікаграфічныя выданні ў перыяд з канца ХІХ – да першай паловы ХХ ст.

**Метадалагічнай базай** дыпломнай работы сталі вучэбныя дапаможнікі па гісторыі лексікаграфіі, напрацоўкі ў галіне тэорыі складання слоўнікаў, даследаванні па праблемах металексікаграфіі. Для вырашэння пастаўленых задач выкарыстаны метад аналізу навуковай літаратуры, апісальны метад, асноўныя прыёмы колькаснага метаду.

**Вынікі даследавання.** Работа з’яўляецца канцэптуальным лексікаграфічным даследаваннем, у якім акрэслены спецыфічныя ўласцівасці лексікаграфічнай крытыкі як гістарычнай з’явы, названы яе тыпалагічныя асаблівасці, а таксама зроблена спроба сфармуляваць асноўныя лексікаграфічныя прынцыпы, характэрныя тэорыі складання слоўнікавых прац канца ХІХ – першай паловы ХХ ст.

Матэрыялы даследавання маюць навукова-тэарэтычную каштоўнасць і могуць быць выкарыстаны пры выкладанні дысцыплін мовазнаўчага профілю, а таксама пры напісанні курсавых і дыпломных работ.